активности, для чего следует использовать методы рефлексивной деятельности («Рефлексивный круг», «Заверши фразу» и др.) [2].

Таким образом, чтобы достичь высокого уровня познавательной активности следует последовательно развивать составляющие ее компоненты.

ЛИТЕРАТУРА:

1. Зеневич, А.М. Проблемы качества клиентоориентированного высшего образования и методики его оценки / А.М. Зеневич, З.В. Пунчик // Проблемы управления – 2008. - №4 – С. 76-83.

2. Кашлев, С.С. Педагогика: теория и практика педагогического процесса: учеб. пособие в 3 ч. Ч.1. / С.С. Кашлев. – Мн.: Зорны верасень – 2005.

УДК 37 : 338.2(476)

## ПРЫХОД АДУКАЦЫІ Ў ІНТАРЭСАХ УСТОЙЛІВАГА РАЗВІЦЦЯ (АУР) НА БЕЛАРУСЬ

**Таранда М.І.**
УА "Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт"
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Тэрмін "устойлівае развіццё" (УР) быў заяўлены на Генеральнай асамблеі ААН ў 1987 годзе як новая мадэль развіцця цывілізацыі. З гэтага моманту "устойлівае развіццё" (Sustainable Development) стала выкарыстоўвацца ў сэнсе руху наперад, калі чалавецтва задавальняе свае жыццёвыя патрэбнасці, не лішая гэтай магчымасці будучыя пакаленні. На канферэнцыі па ахове навакольнага асяроддзя ў Рыа-дэ-Жэнэйра ў 1992 годзе ААН прапанавала ідэю пераадолення глабальнага крызісу, якая атрымала назву "Канцэпцыі ўстойлівага развіцця". Там разглядаліся пытанні пераадолення галыцьбы, дыскрымінацыі жанчын і нацыянальных меншасцяў, аховы здароўя, водазабяспячэння і асветы, забруджання навакольнага асяроддзя, а на канферэнцыі ў Каіры (1994 год) дабавіліся і дэмаграфічныя праблемы. У 1997 годзе Беларусь, Расія і Украіна прынялі нацыянальныя праграмы па ўстойліваму развіццю, накіраваныя на вырашэнне комплексу сацыяльных, эканамічных, дэмаграфічных і экалагічных праблем [1].

Паралельна з канцэпцыяй устойлівага развіцця пачала развівацца і другая канцэпцыя - адукацыя для ўстойлівага развіцця (АУР), першы ўспамін аб якой з'явіўся ў 36 главе "Павесткі дня на XXI век", прынятай у 1992 годзе ААН. Дзеля пачатку працы над АУР былі абраны чатыры галоўныя моманты: паляпшэнне базавай адукацыі, пераарыентацыя існай адукацыі на ўстойлівае развіццё, развіццё інфармаванасці ў грамадстве і выхаванне [2]. У сакавіку 2005 года Еўрапейскай Эканамічнай Камісіяй ААН была апублікавана "Стратэгія для адукацыі ў інтарэсах устойлівага развіцця", а ЮНЭСКА аб'явіла 2005-2014 гады дзесяцігоддзем АУР. Дакладнага азначэння АУР няма, але яго можна прапанаваць у такім напісанні: адукацыя для ўстойлівага развіцця - гэта працэс, які працягваецца на працягу ўсяго жыцця, пачынальна з ранняга дзяцінства да атрымання вышэйшай адукацыі і адукацыі для дарослых, і выходзіць за межы фармальнай адукацыі…

Адукацыя для ўстойлівага развіцця заклікана развіць такія веды, уменні і каштоўнасці, якія дазволяць людзям прымаць індывідуальныя і калектыўныя рашэнні лакальнага і глабальнага характару для паляпшэння якасці жыцця без



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

пагрозы будучыні планеты. На пытанне, што з’яўляецца зместам, прадметам вывучэння АУР, магчымы адказ:

- узаемасувязі - у грамадстве, эканоміцы і прыродзе: на лакальным, рэгіянальным і глабальным узроўнях;
- грамадзянскасць, правы і адказнасць;
- запатрабаванні і правы будучых пакаленняў;
- разнастайнасць культурная, сацыяльная і біялагічная;
- якасць жыцця, раўнапраўе і сацыяльная справядлівасць;
- “устойлівыя” змены - развіццё ў рамках апорнай здольнасці экасістэм;
- будучыня - прагназуемая і непрадказальная [3].

Для ўвасаблення ў жыццё канцэпцыі ўстойлівага развіцця неабходна:

- прыняцце агульначалавечых каштоўнасцяў;
- усведамленне таго, што наша сённяшняя выява жыцця ўплывае на будучыя пакаленні;
- разуменне ўзаемасувязяў у грамадстве і ў навакольным асяроддзі;
- уменне аналізаваць змены ў грамадстве і ў навакольным асяроддзі і прагназаваць наступствы гэтых змен;
- уменне ўжываць наяўныя веды да разнастайных жыццёвых сітуацый;
- навыкі супрацоўніцтва ў рашэнні разнастайных праблем;
- здольнасць да аналітычнага, крытычнага і творчага мыслення;
- паважлівае стаўленне да разнастайнасці ў прыродзе і грамадстве.

Выключна важным для выпрацоўкі навыкаў самастойнага прыняцця экалагічна і сацыяльна значных рашэнняў становяцца: актыўнасць, развіццё крытычнай выявы мыслення, дэмакратычнасць, дынамізм, цэласнасць, інтэграцыя, міждысцыплінарны падыход, выкарыстанне сучасных інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, праблемная арыентаванасць, арыентаванасць на працэс, праектаванне.

АУР можа быць рэалізаваная ў выглядзе асобных вучэбных курсаў і адукацыйных мерапрыемстваў як у сферы фармальнай, так і нефармальнай адукацыі. З метадамі нефармальнай адукацыі мне даводзілася неаднаразова сустракацца. У 2007 годзе быў на семінары па распрацоўцы праектных прапаноў для удзелу ў праграмах Еўрапейскага Саюза ў Кіеве. Там, з прадстаўнікамі самых розных грамадскіх арганізацый, мы, у працоўных групах, сфармаваных па інтарэсах, на працягу 4 дзён вучыліся распрацоўваць заяўкі на праекты па ўстойліваму развіццю рэгіёнаў. Праца была вельмі складанай, але яшчэ больш складаным быў удзел у семінары, які праходзіў восенню 2008 года ў Вільні, на які трэба было з’яўляцца са сваім наўтбукам, бо ўсе распрацоўкі на гэты раз вяліся ў Microsoft Offise Exel. Вясной 2010 пашчасціла папрысутнічаць у Мінску на семінары па нефармальнай адукацыі для дарослых, які праводзіла Галіна Верамейчык – выканаўчы дырэктар МГА “Адукацыя без межаў”. У семінары прымала ўдзел трэнер з Санкт-Пецярбургу. Увогуле, пачынаючы з 2005 года, у Беларусі штогод праводзяцца Тыдні нефармальнай адукацыі і асветы, падчас якіх праводзяцца сустрэчы, семінары, круглыя сталы, прэзентацыі, выставы. У 2006 і 2008 гадах адбыліся Фестывалі нефармальнай адукацыі падтрыманыя dvv-internacional і Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтрам імя Йаханеса Рау, якія сталі не толькі адметнай інфармацыйнай падзеяй, але і святам. З вітальным словам на пленарным

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

паседжанні перад удзельнікамі выступілі прадстаўнікі Міністэрства адукацыі РБ, Палаты прадстаўнікоў НС РБ, амбасад Германіі і Швецыі [4].

У сакавіку 2011 года ў Мінску адбыўся семінар-трэнін "Школа экалагічнага актывіста (першы ўзровень)", на які былі запрошаны выкладчыкі розных ВНУ Беларусі, праца якіх звязаная з экалогіяй. Пасля некалькіх семінараў першага ўзроўню адбудзецца тыднёвая Школа ў мястэчку Камарова, дзе мясцовыя жыхары жывуць у суладдзі з прыродай. За час семінару ў групах удзельнікі вывучалі на практыцы асобныя падыходы, якія можна выкарыстоўваць у сваёй працы са студэнтамі ў АУР.

На семінары мы пазнаёміліся з Нацыянальным планам дзеянняў па рэалізацыі стратэгіі ЕЭК ААН па адукацыі ў інтарэсах устойлівага развіцця у Рэспубліцы Беларусь на 2011-2014 гады, які мае адказных за выкананне – міністэрствы юстыцыі, адукацыі, прыроды, МДЭУ імя А.Д.Сахарава, абл- і гарвыканкамы, УМА ВНУ, РІВШ, грамадскія аб'яднанні. ВНУ атрымаюць дакумент на працягу найбліжэйшага паўгоддзя.

ЛІТАРАТУРА:

1. Рябова, Н.В. В поисках гармонии. Образование для устойчивого развития / Н.Рябова, Т.Новикова. – Минск: Медисонт, 2010. – 102 с.
2. Программа действий: Повестка дня на 21 век и др. документы конференции в Рио-де-Жанейро / Сост.М.Китинг. – Женева. Центр «За наше общее будущее», 1993. – 70 с.
3. Калинин, В.Б. Образование для устойчивого развития / В.Б.Калинин // Вестник АсЭкО. - №3, 2001.
4. Верамейчык, Г. Нефармальная адукацыя ў Беларусі / Г. Верамейчык // Адукатар.- № 2 (18), 2010. – С.2-7.
5. Национальный план действий по реализации стратегии ЕЭК ООН по образованию в интересах устойчивого развития в Республике Беларусь на 2011-2014 г.г. http://ecoedu.iseu.by/uploads/files/NationalPlanESD_draft18.01.11.pdf.

УДК 378.146:63(476.6)

## СИСТЕМА МОТИВАЦИИ ВЫСШЕЙ ШКОЛЫ

**Тарасенко Н.И.**
УО «Гродненский государственный аграрный университет»
г. Гродно, Республика Беларусь

Стимулировать человека можно в любой области человеческих отношений. Особая актуальность этого процесса возникает в учебной деятельности, а любое стимулирование обусловлено в первую очередь мотивацией и направленностью поведения человека.

Мотивация в учебном процессе многогранна, она должна учитывать индивидуальные, моральные, материальные, социально-психологические и другие всевозможные стимулы, которые положительно влияют на усвоение знаний, на формирование навыков и умений, на приобретение каких-то личностных особенностей. Сегодня стратегия обучение должна создавать благоприятные условия для стимулирования и проявления в первую очередь личностного потенциала студентов. Поскольку при организации учебного процесса мы имеем дело с молодыми людьми, у которых еще полностью не сформированы приоритеты, организацию учебных мероприятий необходимо



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ